Падтрымай "Вясну" на PATREON

Паказальна пакаралі. 21-гадоваму палітвязню прысудзілі ажно год «хіміі» за намаляваны сцяг на закінутым будынку

08.12.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні



Мікалай Слёз

8 снежня вінаватым ў здзяйсненні злачынства па артыкуле 341 Крымінальнага Кодэкса Беларусі «Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці» прызналі 21-гадовага Мікалая Слёза.

Гэтую справу **з 6 па 8 снежня разглядаў суд Барысаўскага раёна**. Дагэтуль праваабаронцы **прызналі** Мікалая Слёза **палітвязнем.** Хлопца затрымалі 13 верасня і ўтрымлівалі пад вартай да суда.

Судовае пасяджэнне ўзначальваў **суддзя Дзмітрый Крывела**. На лаве падсудных быў Мікалай Слёз. Хлопец зусім малады - **21 год, жыве ў аграгарадку Кішчына Слабада**. Скончыў школу, потым будаўнічы каледж (былое ПТВ), працаваў будаўніком, але ў 2019-м звольніўся. Зараз беспрацоўны, але ў яго бацькі ажно 3 каровы, статак свіней і вялікая гаспадарка, таму ўвесь свой вольны час хлопец дапамагае па гаспадарцы.

Мікалая абвінавацілі ў тым, што 29 жніўня 2021 года разам са сваім сябрам Андрэем Мажэйкам (крымінальную справу ў адносінах да апошняга суд вылучыў у асобную вытворчасць – Рэд.) ён **намаляваў на закінутым будынку дома культуры ў аграгарадку Кішчына Слабада два бчб- сцяга**. Але на наступную раніцу сцягі хтосьці замаляваў. Хлопцы вырашылі аднавіць свае малюнкі, таму 30 жніўня 2021 года яны зноў намалявалі на будынку сцягі, а па дарозе дадому **размалявалі яшчэ два дрэва ды слуп электраперадач белай і чырвонай фарбамі.**

Падчас суда сведка па гэтай справе паведаміў, што і размаляваны будынак, і **дрэвы са слупам знаходзяцца на тэрыторыі мясцовага Парка герояў**. У тым парку ўсталяваны помнік загінулым воінам Вялікай Айчыннай вайны.

Таксама стала вядома, што сам будынак дома культуры, які размалявалі хлопцы, быў закінуты яшчэ ў 2000 годзе, і з тых часоў ніякага будаўніцтва там не вядзецца. Ёсць нават рашэнне аб зносе гэтага даўгабуду, што і мусіць адбыцца ў недалёкім часе.

Сведка таксама пацвердзіў: **будынак закінуты, не выкарыстоўваецца, не ўяўляе сабой ніякай каштоўнасці**. Дрэвы, якія размаляваў абвінавачаны, знаходзяцца недалёка ад помніка воінам, але паркам гэтае месца назваць цяжка, бо ніхто яго не даглядае.

Вядома, што сам помнік хлопцы не размалёўвалі. У сваёй прамове адвакат сказаў, што ніякай шкоды Мікалай не нанес, таму што будынак разбураны, іншыя аб'екты не пацярпелі. **Агульная шкода за два дні размалёўвання склала 51 рубель.**

Сам хлопец сваю віну прызнаў цалкам. 8 верасня напісаў яўку з павіннай. Супрацоўнічаў са следствам. Падчас допытаў раскаяўся, нават напісаў прашэнне на імя суда не пазбаўляць яго волі.

Але пры гэтым **пракурор запрасіў для абвінавачанага 1,5 года «хіміі».**

Адвакат пасля слоў пракурора абурыўся. Маўляў, *«вы ж пералічылі, што ў хлопца ажно 3 аблягчаючых: яўка з павіннай, раскаянне, супрацоўніцтва з следствам, ніводнага абцяжваючага, і тым не менш, просіце амаль найвышэйшую санкцыю»?*

Адвакат папрасіў для Мікалая **2 месяцы арышту** і, ўлічваючы тэрмін у СІЗА (хлопец адседзеў па сваёй справе амаль 3 месяцы), вызваліць яго і лічыць тэрмін пакарання адбытым.

8 снежня суд вынес прысуд па справе. Мікалая Слёза **прызналі вінаватым** ў здзяйсненні злачынства **па артыкуле 341 Крымінальнага Кодэкса Беларусі** за апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці і **прысудзілі 1 год абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу.** Хлопца вызвалілі ў зале суда.

Твитнуть







Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY